Зязюля А.Р.,
ст.выкладчык
Александровіч А.Р.
дацэнт

## АБ ВЫКЛАДАННІ КУРСА «СУЧАСНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ПРЫРОДАЗНАЎСТВА, ТЭХНІКІ І ВЫТВОРЧАСЦІ» НА ФАКУЛЬТЭЦЕ БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНЫХ СІСТЭМ

Курс «Сучасныя праблемы прыродазнаўства, тэхнікі і вытворчасці» ўведзены ў новыя навучальныя планы бібліятэказнаўчых спецыялізацый у 1994/95 навучальным годзе і з'яўляецца пераемнікам адпаведных курсаў, якія раней чыталіся на факультэце бібліятэчна-інфармацыйных сістэм.

Гэты курс з'яўляецца сінтэтычным і ўключае вывучэнне найбольш фундаментальных праблем сучасных прыродазнаўчых і тэхнічных навук і матэрыяльнай вытворчасці. Увядзенне яго ў праграму прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкараў і бібліёграфаў у першаю чаргу звязана з вялікай колькасцю навуковай і тэхнічнай літаратуры па названых галінах ведаў.

Пры распрацоўцы курса мы зыходзілі з яго галоўнай мэты - даць студэнтам дакладныя веды ў галіне сучаснага прыродазнаўства, тэхнікі і вытворчасці. Трэба адзначыць, што пераважная колькасць навуковых адкрыццяў, тэхнічных дасягненняў і станаўленне сучаснай вытворчасці прыпадаюць на апошнія 100-200 гадоў. Канец XIX стагоддзя - гэта час росквіту класічнай тэорыі і адначасова нараджэння новых падыходаў, і новых тэорый, і новага светапогляду ў прыродазнаўчых і тэхнічных навуках.

Асноўная ўвага ў курсе надаецца вывучэнню канкрэтнага зместу навуковых дасягненняў, сутнасці з'яў, гісторыі развіцця, тэрміналогіі і класіфікацый, прынятых у адпаведных галінах навукі тэхнікі і вытворчасці.

Ужо ў самым пачатку курса намі ставіцца мэта фарміравання прафесійнай матывацыі навучання. З гэтай нагоды мы разглядаем прыродазнаўчыя навукі як падмурак і важную частку гуманітарнай культуры будучага спецыяліста. Таму асобая ўвага звяртаецца на праблемы ўзаемасувязі развіцця навукі, культуры і сучаснай цывілізацыі. Гэта вельмі важнае пытанне, якое датычыцца не толькі стварэння трывалай псіхалагічнай устаноўкі да набыцця ведаў, але мае прынцыповы ўплыў на фарміраванне светапогляду студэнтаў.

Змест курса ствараўся з улікам натуральнага ўзаемадзеяння навук на аснове сістэмнага падыходу. У першую чаргу разглядаюцца найбольш простыя фізічныя сістэмы, затым ажыццяўляецца пераход да вывучэння больш складаных аб'ектаў хімічнай навукі і да найбольш складаных біялагічных сістэм. Развіццё навукі і тэхнікі цесна звязана з функцыянаваннем сучаснай энергетычнай, прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці. На ўсіх этапах вывучэння курса разглядаюцца праблемы ўзаемадзеяння прыродазнаўчых навук у гістарычным аспекце, уплыў навуковых ведаў, атрыманых у той ці іншай галіне навукі, на развіццё сучаснай цывілізацыі. Шырока асвятляюцца праблемы ўплыву эмпірычных адкрыццяў у практычных галінах на развіццё сучаснай тэорыі. На падставе вывучэння глабальных перспектыў ўзаемаадносін сучаснай тэхнагеннай цывілізацыі і навакольнага асяроддзя разглядаюцца актуальныя экалагічныя праблемы на Беларусі.

Найбольш складаныя пытанні, якія тычацца знаёмства з асновамі тэорыі адноснасці, квантавай і касмалагічнай тэорый, тэарэтычнай і эвалюцыйнай біялогіі, разглядаюцца на лекцыйных занятках.

Вывучэнне курса мае прынцыповае значэнне ў падрыхтоўцы спецыялістаў, якія працуюць з навуковай і тэхнічнай літаратурай.

На наш погляд, пашырэнне і паглыбленне ведаў студэнтаў факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм у галінах прыродазнаўства, сучаснай тэхнікі і вытворчасці акажуць станоўчы ўплыў на агульнанавуковую падрыхтоўку студэнтаў універсітэта, на фарміраванне светапогляду і значнае ўдасканаленне іх прафесійнага ўзроўню.

Бураўкін А.Г.,
дацэнт
Мятлюк К.М.,
выкладчык

## КАМП'ЮТЭРНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ Ў НАВУЧАЛЬНЫМ ПРАЦЭСЕ ТВОРЧЫХ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫЙ

На факультэце культуралогіі ўкараняюцца наступныя курсы

| Кафедра | Назва курса |
|---|---|
| для ўсіх спецыялізацый | вылічальная тэхніка |
| народныя рамесствы | камп'ютэрная графіка |
| педагогіка сацыякульт. дзейнасці | камп'ютэрныя тэхналогіі гульнявой дзейнасці |
| арганізацыі тэатральнай творчасці | камп'ютэрныя тэхналогіі апрацоўкі літаратурных тэкстаў |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На факультэце мастацкай творчасці ўкараняюцца наступныя курсы

| Кафедра | Назва курса |
|---|---|
| народная песенная творчасць | камп'ютэрныя тэхналогіі апрацоўкі фальклорнага матэрыялу |
| духавая музыка | камп'ютэрныя тэхналогіі ў духавой музыцы |
| эстрадная музыка | камп'ютэрныя тэхналогіі ў музыцы |
| харавое мастацтва | камп'ютэрная апрацоўка музычных тэкстаў |
| харэаграфія | камп'ютэрныя тэхналогіі ў харэаграфіі |
| народная інструментальная творчасць | камп'ютэрны практыкум (у межах курсаў спецыялізацыі) |

Мэта азначаных курсаў - даць студэнтам веды і ўменні па ажыццяўленню камп'ютэрнай падтрымкі тых відаў дзейнасці, якія ўвасабляюць адпаведную спецыялізацыю.

Бураўкін А.Г.,
дацэнт
Зязюля А.Р.,
ст.выкладчык

## ІНФАРМАТЫЗАЦЫЯ ПРАЦЭСАЎ КІРАВАННЯ Ў КУЛЬТУРЫ

Прыняцце рашэнняў (кіраванне) звязана з аналізам (апрацоўкай) вялікай колькасці разнастайнай інфармацыі. Мэнеджэру ў сферы культуры неабходна валоданне сродкамі сістэмнай і камп'ютэрнай падтрымкі.

Курс «Вылічальная тэхніка» выкладаецца на спецыялізацыі «мэнеджмэнт сацыяльна-культурнай сферы». Мэта курса - даць студэнтам веды аб выкарыстанні камп'ютэрнай тэхнікі з ужываннем стандартных сродкаў сістэмнай падтрымкі.

Змест курса складаюць раздзелы:

- аперацыйная сістэма (MS DOS);
- праграмная абалонка Norton Commander;
- тэкставыя рэдактары (апрацоўка дакументаў);
- спецыялізаваныя праграмныя сродкі (матэматычныя, графічныя метады і элементы канструявання баз звестак на прыкладзе таблічнага працэсара SuperCalc).

Бураўкін А.Г.,
дацэнт
Астапенка А.У.,
дацэнт

## КАМП'ЮТЭРНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ Ў МУЗЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ

Структура курсаў, якія ўкараняюцца на музычных спецыялізацыях:

| Кафедры | Аперац. сістэма | Праграм. абалонка NC | Тэкставыя рэдактары | Базы звестак | Музычныя рэдактары |
|---|---|---|---|---|---|
| народная песенная творчасць | ■ | ■ | ■ | ■ | ■ |
| духавая музыка | ■ | ■ | ■ | | ■ |
| харавое мастацтва | ■ | ■ | ■ | | ■ |
| эстрадная музыка | ■ | ■ | ■ | | ■ |
| народная інстр. творчасць | ■ | ■ | ■ | | ■ |

Азначэнні прыярытэтаў:

■ - нязначны;

■ - значны;

■ - вельмі значны;

Кірэеў У.А.,
дацэнт

## ДА ПЫТАННЯ ВЫКАРЫСТАННЯ АЎДЫЁВІЗУАЛЬНЫХ СРОДКАЎ У ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ СТУДЭНТАЎ

1. Практычна ўсе мерапрыемствы па розных напрамках выхавання, лекцыі па мастацтвазнаўству і гісторыі карыстаюцца вялікім поспехам, калі яны праводзяцца ў суправаджэнні аўдыёвізуальных сродкаў. З іх дапамогай іх могуць быць зафіксаваны асобныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ